**ЗАКЛЮЧНЫЯ ЗАНЯТКІ** як этап вывучэння мастацкага твора. Змест заключных заняткаў можа быць накіраваны на паглыбленае разуменне аўтарскай пазіцыі, характараў герояў, месца твора або ўсёй творчасці пісьменніка ў агульным літаратурным працэсе і ў жыцці грамадства.

Абагульняльная гутарка (дыспут), лекцыя настаўніка, віктарына, літаратурны дыктант, конкурс чытальнікаў, даклады і рэфераты вучняў, супастаўленне мастацкага твора са спектаклем або кінаверсіяй – асноўныя метады і прыёмы на заключных занятках. Заключныя заняткі – гэта не паўтарэнне раней вывучанага, а менавіта падвядзенне вынікаў. Выбар формаў працы павінен быць абгрунтаваны.

Змест і методыка правядзення заключных заняткаў шмат у чым залежыць ад родавай і жанравай спецыфікі твора. Вывучэнне лірыкі лагічна завяршыць конкурсам на лепшую дэкламацыю вершаў, драматычнага твора – абмеркаваннем спектакля або лекцыяй пра тэатральнае жыццё п'есы, эпічнага твора – дыспутам, канферэнцыяй, супастаўленнем з іншымі мастацкімі творамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ